# Чайная супраць карчмы

## Барацьба з алкагалізмам на Беларусі ў 2-й палове XIX стагоддзя

**Злоўжыванне алкаголем заўсёды лічылася фактарам, які аслабляе здароўе чалавека, негатыўна ўплывае на яго фізічнае і маральнае аблічча, вядзе да страты дабрабыту і нават самога жыцця. У другой палове XIX стагоддзя ў Расійскай імперыі п'янства і алкагалізм сталі сапраўдным бедствам, медыцынскай і сацыяльнай праблемай. На гэты перыяд прыпадае і пік змагання з алкагалізмам у краіне. Вопыт дзяржаўнага і грамадскага процістаяння ганебнай з'яве, а таксама памылкі і пралікі ў гэтай справе могуць быць карыснымі ў выпрацоўцы мер па антыалкагольнай барацьбе ў сучаснай Беларусі.**



**Людміла РОГАЧ, малодшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея**

### Грамадская ініцыятыва

У пачатку 50-х гадоў XIX стагоддзя ў межах заходніх губерняў Расійскай імперыі арганізоўваюцца антыалкагольныя народныя суполкі. Перадумовай іх узнікнення стала тое, што дзяржава значна павысіла цэны на віно (так называлі гарэлку) для адкупшчыкаў. Каб пакрыць свае выдаткі, яны таксама сталі павышаць цэны на алкагольную прадукцыю. Гэта і выклікала пратэст сярод спажыўцоў моцных напіткаў, найперш сялян, і яны пачалі аб'ядноўвацца ў антыалкагольныя групы, члены якіх у прысутнасці святара давалі клятвы не піць. Вядома, што ў 1859 годзе ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні сяляне з 65 двароў заключылі паміж сабой згоду не піць гарэлкі *[1, л. 226]*. Жыхары вёскі Відрэнкі Чэрыкаўскага павета вырашылі, што не будуць піць больш як чарку гарэлкі ў час адпрацоўкі паншчыны, празмерна напівацца і сядзець «па корчмах» *[1, л. 226]*. Святар Святошыцкай царквы Аршанскага павета ў час службы ўплываў на прыхаджан, каб яны адракліся ад ужывання спіртнога *[1, л. 233]*. У 1856 годзе адмовіліся піць сяляне некаторых вёсак Быхаўскага павета *[2, л. 1]*.

У 1869 годзе ў цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў губернатарам гаварылася, што ўстрыманне ад п'янства з'яўляецца найлепшым сродкам для захавання народнага дабрабыту. Тым не менш мясцовым уладам загадвалася не дазваляць насельніцтву ўтвараць антыалкагольныя таварыствы *[1, л. 38]*, бо яны прымалі выгляд адкрытага пратэсту супраць продажу віна і маглі даць падставу адкупшчыкам патрабаваць нявыгаднага для дзяржавы змяншэння збораў. Відавочна, дзяржава імкнулася абараніць права адкупшчыкаў на прыбытак ад прададзенага імі віна ў першую чаргу для таго, каб забяспечыць стабільны даход у казну.

Тым часам п'янства і алкагалізм працягвалі прыводзіць народ да галечы. Аналіз дакументаў пад назвамі «Рапорты полиции о происшествиях» і «Ведомости о происшествиях в уездах» даў магчымасць вызначыць, што найбольшая колькасць злачынстваў і няшчасных выпадкаў у піцейных установах у другой палове XIX стагоддзя здаралася праз п'яны разгул. Карціну жыцця тагачаснага грамадства ствараюць наступныя радкі, занатаваныя ў пратаколах паліцыі: «…смерть наступила от чрезмерного употребления им водки…» *[3, л. 55]*, «…скоропостижно умер от чрезмерного употребления спиртного…» *[4, л. 35]*, «…упомянутый Гурин вел жизнь нетрезвую, и вследствии сего возвращаясь

**ПРА АЎТАРА**

РОГАЧ Людміла Фёдараўна.

Нарадзілася ў вёсцы Залессе Смаргонскага раёна. Скончыла гістарычны факультэт БДПУ імя М. Танка (2008), магістратуру (2009) і аспірантуру Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (2013).

У 2008–2009 гадах працавала настаўніцай у школе ў вёсцы Залессе. З 2014 года – малодшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя сістэмы грамадскага харчавання на тэрыторыі Беларусі ў XVI – пачатку XX стст., гісторыя рода Агінскіх.

из корчмы домой хотел вешаться» *[5, л. 10]* і інш.

На старонках газет Расійскай імперыі ў канцы 60-х гадоў XIX стагоддзя разгарэлася паленіка аб прычынах п'янства. Аўтары абмяркоўвалі, якія меры трэба выкарыстоўваць для барацьбы з алкагалізмам *[6, л. 1]*. Прадстаўнікі інтэлігенцыі выступалі з артыкуламі і друкавалі брашуры антыалкагольнага зместу. Так, доктар медыцыны М. Шыпаў аналізаваў алкагалізм у медыцынскім і гістарычным аспектах. Ён прапаноўваў забараніць продаж спіртнога ў рэстаранах з музыкай і забаўляльнымі мерапрыемствамі, увесці ў навучальных установах прадмет па антыалкагольнай прапагандзе, а шынкароў прымушаць лячыць алкаголікаў за свае сродкі *[7, с. 26–27]*.

## Дзяржаўная палітыка

У апошняй чвэрці XIX стагоддзя царская ўлада ўзяла на сябе ініцыятыву ў пераадоленні шкодных наступстваў п'янства. Аднак кіруючыя колы віну за распаўсюджванне алкагалізму імкнуліся перакласці на корчмы, шынкі і інш. У 1881 годзе Міністэрствам унутраных спраў была падрыхтавана запіска з абвінавачаннем піцейных устаноў у давядзенні да галечы сялянскага насельніцтва *[8, л. 1]*. Такім чынам, галоўны напрамак дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання быў узяты на рэфармаванне ў сферы грамадскага харчавання.

Для змагання з алкагалізмам было вырашана найперш правесці скарачэнне колькасці ўстаноў шынковага промыслу. Такія меры сталі ўводзіцца ўжо з 1864 года. Забараняўся гандаль спіртным у прадуктовых крамах, павялічвалася патэнтная плата за гандаль алкаголем (патэнт – дзяржаўнае пасведчанне, што зацвярджае права прадпрымальніка займацца пэўным відам дзейнасці; у гэтым выпадку – права на гандаль спіртным). У 1871–1872 гадах адбылося чарговае павелічэнне патэнтнай платы. Гэта ўскосна паўплывала на скарачэнне колькасці піцейных устаноў. Такое рашэнне прымалася, зыходзячы з вопыту: кожны раз, як урад ішоў на гэта, колькасць піцейных устаноў скарачалася. Былі вызначаны найменшыя і максімальныя сумы патэнтаў, а права назначаць канчатковы кошт было дадзена губернскім адміністрацыям: яны павінны былі ўлічваць тэрытарыяльныя асаблівасці. Для беларускіх губерняў прадугледжваліся паслабленні ў плацяжах: змяншаліся памеры выплат, у тым ліку для корчмаў, якія на гэтых тэрыторыях мелі характар пастаялых двароў і гасцініц, а не піцейных дамоў.

У 1868 годзе адкрыццё ўстаноў піцейнага промыслу ставілася ў залежнасць ад дазволу мясцовых органаў улады. Абмяжоўвалася колькасць корчмаў паблізу навучальных устаноў, казармаў і турмаў. Забаранялася адкрываць шынкі пры гандлёвых дамах і рынках. Уводзіліся падрабязныя правілы ўнутранага рэгулявання дзейнасці піцейных устаноў: патрабаванні да вонкавага выгляду і ўнутранага ўбрання, да гігіены работнікаў і якасці прыгатавання ежы.

Частку сваіх функцый у адсочванні дзейнасці піцейных устаноў органы ўлады пераклалі на мясцовае кіраўніцтва. Так, права ліквідаваць піцейныя ўстановы было дадзена губернатарам *[8, л. 1]*. У 1882 годзе Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам дзяржаўнай маёмасці быў распрацаваны праграмны дакумент «Об изменении правил о питейной торговле с целью ограничения употребления крепких напитков». Адным з галоўных ідэйных палажэнняў дакумента стала перакананне ў неабходнасці скарачэння колькасці піцейных устаноў *[9, л. 1]*.

## Пашырэнне паўнамоцтваў

Грамадскія антыалкагольныя групы на месцах дазвалялася ствараць з ведама ўрада. Мясцовым органам кіравання і жыхарам давалася права патрабаваць закрыцця піцейных устаноў, трымальнікі якіх дапускалі ў гандлі парушэнні. Праўда, часам такое права станавілася сродкам дасягнення ўласных карыслівых мэт. Паказальным стала « Дело об открытии помещиком Демидовичем корчмы в деревне Жиндра Игуменского уезда» *[10, л. 1]*. У 1890 годзе селянін Г. Салаўянчыкаў з вёскі Жындра накіраваў ва ўпраўленне акцызнымі зборамі данос аб незаконным адкрыцці памешчыкам Дзямідовічам карчмы. Экспертыза паказала, што гэтая карчма была адкрыта яшчэ ў 1886 годзе ў адпаведнасці з усімі правіламі і нормамі. Скаргаў сялян навакольных вёсак на дзейнасць карчмы не паступала. Па версіі камісіі, заява Г. Салаўянчыкава была выклікана жаданнем самому адкрыць













**◀ Малюнкі з ілюстраванага альбома Д.Г. Булгакаўскага «Эхо. Пьянство и его последствия». 1898 год**

карчму ў той жа вёсцы. Упраўленне акцызнымі зборамі стала на бок памешчыка, бо не знайшло падстаў забараніць дзейнасць яго карчмы.

Часам матывы, якія штурхалі мясцовыя супольнасці на хадайніцтвы аб закрыцці піцейнай установы, былі вельмі дзіўнымі. Так адбылося з карчмой у вёсцы Ліхінічы Магілёўскай губерні. Там сяляне пастанавілі закрыць яе... у гонар імператарскай сям'і, выказваючы гэтым асаблівую павагу царскім асобам *[11, л. 1]*.

Прынятыя меры па скарачэнні колькасці піцейных устаноў стрымлівалі свабодную канкурэнцыю і, натуральна, мелі адмоўныя вынікі: зніжалася якасць паслуг і абслугоўвання; стымулявалася завышэнне цэн на прадукты харчавання і спіртное, што прыводзіла да беспатэнтнага гандлю спіртным і разбурала культуру спажывання алкаголю. Негатыўныя наступствы мела і наданне вясковым сходам шырокіх правоў па закрыцці такіх устаноў. Гэта часам станавілася спосабам дасягнення карыслівых інтарэсаў тых, хто накладаў забароны, сродкам спекуляцыі і вымагання хабару з трымальнікаў корчмаў і шынкоў.

Ва ўмовах абмежаванняў шынкары ўсімі магчымымі спосабамі імкнуліся пакрыць свае выдаткі і, як правіла, неабгрунтавана завышалі цэны, эканомілі пры вырабе страў (памяншалі порцыі, не ўкладалі ўсіх неабходных інгрэдыентаў), недаплачвалі работнікам такіх устаноў.

## Закон патрабуе...

Палажэнне «О трактирных заведениях» ад 1861 года забараняла прадаваць спіртное malaletнім (да 16 гадоў). Таксама замацоўваўся абавязак гандляроў алкаголем не дапускаць, каб кліенты напіваліся да страты прытомнасці *[12, л. 19]*. Законам у сферы гандлю спіртным ад 1882 года замацоўвалася наступнае: 1) строга караць за гандаль спіртным без дазволу; 2) прыцягваць да суда тых, хто ведае аб выпадках тайнага гандлю спіртным, але замоўчвае іх; 3) караць мясцовых чыноўнікаў, якія ведаюць пра выпадкі незаконнага гандлю спіртным, аднак не прымаюць ніякіх мер для іх прадухілення; 4) караць гандляроў, што разбаўляюць віно вадою ці прадаюць яго ў пазыку; 5) штрафаваць за з'яўленне

ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе; 6) не дапускаць продажу алкаголю асобам да 16-гадовага ўзросту, а таксама відавочна п'яным людзям; 7) за адкрыццё піцейнай установы ў недазволены час шынкара караць штрафам ці турэмным зняволеннем; 8) наглядаць за асобамі, заўважанымі ў сістэматычным п'янстве *[9, л. 61]*. Асаблівая роля адводзілася паліцыі: яна павінна была назіраць, каб піцейныя ўстановы адпавядалі вызначанаму для іх тыпу, каб асобы, што адкрывалі такія ўстановы, былі законапаслухмянымі *[9, л. 25]*.

У 1885 годзе ў законе «Уложения о наказаниях уголовных и исправительных» замацоўвалася пакаранне паштальёна, які падчас суправаджэння пошты мог зайсці ў карчму *[13, л. 99]*. У тым жа годзе вызначаны штрафы трымальнікам піцейных устаноў, калі яны пакідалі п'янага кліента без нагляду *[13, л. 127]*. У 1899 годзе былі ўнесены папраўкі ва «Устав о наказаниях»: у ім з'явіліся артыкулы аб штрафе за п'янства ў публічных месцах *[13, л. 41]*.

## Утварэнне папячыцельстваў

Утварэнне ў 1897 годзе папячыцельстваў аб народнай цвярозасці стала важнай дзяржаўнай ініцыятывай у змаганні з п'янствам *[14, л. 125]*. Ставілася мэта адцягнуць жыхароў ад шынкоў і прапанаваць ім іншыя спосабы баўлення часу, такія як наведванне народных чытанняў, вечароў, чайных устаноў *[13, л. 1]*. У дзейнасць гэтых арганізацый уваходзіла прапаганда сярод насельніцтва інфармацыі аб шкодзе спіртнога для здароўя чалавека, выданне брашур і інфармацыйных лістоў, а таксама наведанне ўстаноў грамадскага харчавання ў якасці кантралёраў.

Цяжка сказаць, наколькі эфектыўнай была дзейнасць папячыцельстваў. Адносіны да іх з боку органаў дзяржаўнай улады мелі дэкларатыўны характар. Пэўны фармалізм дзейнасці гэтых арганізацый пацвярджаецца тым, што ў некаторых паветах папячыцельствы аб народнай цвярозасці так і не былі канчаткова сфарміраваны. Як бачна са справаздачы прадстаўніка ваўкавыскага дваранства на імя губернатара, «попечительство о народной трезвости еще не проявило своей деятельности, открыв только чайную в городе Волковыске; кроме того, попечительство это и не сформировалось окончательно» *[15, л. 110]*. На месцах жа было шмат спадзяванняў на гэтыя арганізацыі. У 1898 годзе брэсцкі павятовы прадвадзіцель дваранства рапартаваў гродзенскаму губернатару, што папячыцельствы аб народнай цвярозасці з'яўляюцца вельмі карыснымі арганізацыямі і могуць паўплываць на павышэнне агульнай культуры ў народзе не толькі праз скарачэнне спажывання спіртнога, але і праз арганізацыю народных чытальняў і чайных *[15, л. 110]*.

Для кантролю за дзейнасцю папячыцельстваў у Расійскую імперыю былі запрошаны замежныя эксперты. Так, доктар Эгерс, які прыбыў з Германіі ў 1910 годзе, станоўча ацаніў дзейнасць папячыцельстваў у Віленскай губерні. Аднак раскрытыкаваў ігнараванне інтарэсаў мясцовага насельніцтва, якое, на думку нямецкага спецыяліста, валодае сфарміраванай культурай спажывання ежы і алкаголю, а таму мае неабходнасць у развітой сетцы ўстаноў харчавання *[16, л. 10]*.

Вынікам дзейнасці папячыцельстваў стала арганізацыя чайных і народных сталовых. Асноўнай ідэяй было тое, што чайная павінна быць не толькі буфетам для продажу ежы, але і выконваць функцыі народнага клуба. Адкрываліся такія ўстановы ў дастаткова прасторных і светлых памяшканнях, туды штодзённа дасылалі газету, штотыдзень ці штомесяц прыходзіў ілюстраваны часопіс. Прадугледжвалася і стварэнне пры чайных бібліятэк. Публіцы прапаноўваліся і пэўныя забавы, напрыклад, арганізацыя гімнастычных практыкаванняў, музычных вечароў і гульняў (кеглі, шашкі, «гарадкі») *[14, л. 135]*. У чайных прадавалі чай, малако, кефір, квас, ліманад, а з ежы – мясныя вырабы, печыва, насенне сланечніка, а вось прадаваць спіртное строга забаранялася *[14, л. 136]*. Намаганнямі членаў папячыцельстваў адкрываліся таксама танныя народныя сталовыя. Тым не менш папячыцельствы аб народнай цвярозасці так і не змаглі рэалізаваць свой патэнцыял у многім з-за адносна кароткага часу свайго функцыянавання. Яно фактычна прыпынілася ў 1914 годзе, а канчаткова было згорнута ў 1917-м.

## Увядзенне дзяржаўнай манаполіі

Маштабным комплексам мерапрыемстваў царскай улады па перабудове сістэмы

грамадскага харчавання стала ўвядзенне віннай манаполіі – выключнага права дзяржавы на вытворчасць і продаж спіртнога. Манапалізацыя праходзіла з 1894 па 1913 год. Мэтай гэтай рэформы стала памкненне «оградить народное благочиние от того растлевающего влияния, которое имели на него укоренившиеся с давнего времени условия частной питейной продажи» *[13, л. 1]*. Функцыі продажу алкаголю перакладаліся выключна на дзяржаўныя крамы, якія рэалізоўвалі алкагольную прадукцыю ў вялікай колькасці: кожная – ад 3000 да 10 000 вёдраў за год. Прадавалася пітво толькі на вынас і без закускі. Згубнасць такога метаду гандлю відавочная як з медыцынскага пункту погляду, так і з сацыяльнага: празмернае ўжыванне спіртнога, ды яшчэ і без закускі, шкодзіла здароўю чалавека, а выпіўкі на вуліцах правакавалі грамадскі непарадак і разгул *[13, л. 170]*.

Забарона распівачнага гандлю супярэчыла народным звычкам калектыўнасці, а таксама шматвекавой традыцыі дзейнасці корчмаў. Гэтая мера не толькі не прынесла жаданых вынікаў па змяншэнні п’янства, але і павялічыла колькасць людзей, што выпівалі ўжо не ў сценах піцейных устаноў, а на вуліцах, часта ў людных месцах. Зборышчы выпівох на вуліцах стваралі паліцыі дадатковую нагрузку. Выпіванне ў шынку ці карчме пэўным чынам дысцыплінавала чалавека, бо ён падпарадкоўваўся распарадку работы такой установы, а з-за неналежных паводзін мог быць літаральна выкінуты за дзверы, таму мусіў стрымліваць сябе і піць менш.

Акрамя таго, манапалізацыя правакавала тайны гандаль спіртным па цэнах, значна ніжэйшых за тыя, што былі ў дзяржаўных крамах. У адным з праектаў «О принятии мер к сокращению публичного пьянства» ад 1906 года занатавана канстатацыя ўскосных вынікаў манапольнай рэформы: «Молодежь, имеющая возможность приобретать вино в тайных притонах во всякое время дня и ночи, рано приучается к пьянству, вследствие чего пьяные буйства, разгул и кража хлеба и принадлежностей домашнего хозяйства для покупки вина сделались обычным явлениями в деревнях и заводах» *[13, л. 174]*.

Такім чынам, праблема алкагалізму сярод насельніцтва ў межах заходніх губерняў Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі была надзвычай актуальная і патрабавала свайго вырашэння. Спосабы змагання з гэтай з’явай выпрацоўваліся актыўнымі групамі грамадства і органамі дзяржаўнай улады. Але ж прынятыя дзяржавай меры закранулі галоўным чынам дзейнасць устаноў грамадскага харчавання, што прывяло да скарачэння іх колькасці. Варта зазначыць, што ў беларускіх губернях праводзілася больш лаяльная антыалкагольная палітыка (ніжэйшыя падаткі, захаванне большай колькасці корчмаў), бо ўлічвалася, што на гэтых тэрыторыях п’янства не дасягнула катастрафічных памераў, а самі ўстановы традыцыйна служылі прыстанкам для падарожных, крамамі, месцамі адпачынку.

Адзін з членаў Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі ў 1881 годзе выказаў слушнае меркаванне: «Единственными коренными мерами против безобразий пьянства и раздробительной торговли крепкими напитками были, есть и всегда будут поднятие образования и экономического благосостояния простого народа» *[9, л. 94]*. Падаецца, што гэтыя думкі ў пэўнай ступені актуальныя і ў наш час. Немагчыма разлічваць толькі на паліятыўныя меры, барацьба з алкагалізмам павінна быць часткай мэтанакіраванай палітыкі дзяржавы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА) у Санкт-Пецярбургу. – Фонд 1286. – Воп. 20. – Спр. 1586.
2. РДГА. – Фонд 796. – Воп. 445. – Спр. 711.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 1590.
4. НГАБ. – Фонд. 2001. – Воп. 1. – Спр. 1681.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Фонд. 1. – Воп. 6. – Спр. 344.
6. РДГА. – Фонд 1024. – Воп. 1. – Спр. 38.
7. Шипов, Н.Н. Алкоголизм и революция / Н.Н. Шипов. – Спб.: Тип. Спб. Град., Измайл., 1908 / Электронная библиотека Гумер [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/History/Article/shipov_rev.php. – Дата доступу: 21.03. 2013.
8. РДГА. – Фонд. 576. – Воп. 1. – Спр. 1186.
9. РДГА. – Фонд. 574. – Воп. 9. – Спр. 94.
10. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 4694.
11. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 1507.
12. РДГА. – Фонд 1609. – Воп. 1. – Спр. 227.
13. РДГА. – Фонд 575. – Воп. 2. – Спр. 2339.
14. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 1705.
15. НГАБ у Гродна. – Фонд 1. – Воп. 18. – Спр. 484.
16. РДГА. – Фонд 575. – Воп. 11. – Спр. 192.